Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 40 (69) Субота, 31 -га сьнежня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае ад[...] " PRZEGLĄD WILEŃSKI" w. Wilno Ul. Uniwersytecka Nr. 9 [...]ая і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратызм.—[...] Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана [...]
„ „ „ [...]
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Бел. Нац. Рада і Партыя, Т-ва „ПРАСЬВЕТА" і Бел. К-т па справам Самаурадау вітаюць сваіх сябрау і прыхільнікау з НОВЫМ ГОДАМ!

З НОВЫМ ГОДАМ!

У пярэдадні новага 1927 году мы, аглядаючы пражыты год, констатавалі пэўныя зьмены на лепшае і ставілі добры гороскоп для Беларускага Народу на 1927 г.

Сяньня ў пярэдадні Новага — 1928 Году мы можам констатаваць ужо шмат рэальных і карысных фактаў, якія знамянуюць сабою новую эру ў адносінах Польскай Дзяржавы да Беларускага Народу. Можа ў першы раз у сучаснай гісторыі Польшчы адносіны паміж Польскім і Беларускім Народам сталі на ґрунт узаемнага паразуменьня і супольнай працы. Ці-ж гэта не вялікая зьмена, што разьбіваемае сыстэматычна папярэднімі ўрадамі Вітосаў і Грабскіх беларускае школьніцтва пачынае зноў будавацца? Урад Пілсудзкага меў адвагу, не баючыся абвінавачваньняў шовіністаў-палякаў у здрадзе польскасьці, палажыць першую цэгліну пад урадовую беларускую пачатковую школу. Няхай мы гэткіх школаў маем толькі 19! Няхай ў гэтых школах ня ўсюды настаўнікамі беларусы, але павялічваньне гэтых школаў залежыць ад беларускага грамадзянства. А каб настаўнікамі ў іх былі беларусы, павінны аб гэтым паклапаціцца беларускія культурна-асьветныя арганізацыі.

Ці-ж ня ёсьць зьменай на лепшае, што занядбалыя да гэтага часу нашыя беларускія землі пачынаюць набіраць адзнакаў заходняе культуры? Нашыя землі пакрываюцца густою сеткаю сельска-гаспадарчых гурткоў (kółek rolniczych), пазычковых касаў, сялянскіх банкаў, культурна-гаспадарчых установаў, як млечарні і г. д. За гэты *кароткі час* зроблена вельмі многа ў кірунку палепшаньня і падняцьця гаспадарчага роўня беларускае вёскі. Праўда зноў-жа ня ўсюды вельмі карысная дзейнасьць усіх гэтых гаспадарча-эканамічных установаў дасягнула глыбі народнай. Ня ўсюды насяленьне разумее карысьць гэтых установаў, але масавае ўступленьне беларускага сялянства ў апошнія часы да гэтых гаспадарчых арганізацыяў паказвае, што найбольш сьвядомая частка беларусаў гэта разумее.

Далей, ці можна параўнаць сяньняшні Самаўрад з тым, які мы мелі хаця-бы год назад? Папярэднія гмінныя рады былі пародыяй выбарных установаў. Вызначаныя старостамі войты, якіх было да 80% і чуўшыя сябе царыкамі ў сваей гміне, зварачвалі ўвагу амаль ня выключна на выкананьне падатковых і адміністрацыйных загадаў старасты, і зусім ня дбалі аб патрэбах і жаданьнях насяленьня. Гэтыя папярэднія гмінныя рады адзначаліся поўным безабліччам і адсутнасьцю якой небудзь грамадзкай ініцыятывы і дзейнасьці.

Сяньня мы маем сьвядомыя гмінныя рады. Гэтыя рады *думаюць і клапоцяцца і аб патрэбах насяленьня.* Бо ці-ж пасьмела-бы якая-небудзь папярэдняя гмінная рада асыгнаваць 400 зл. на беларускую гімназію, як гэта зрабіла гмінная рада ў Сіняўцы?...

Нарэшце ці ня ёсьць зьменай на лепшае, што на нашых землях *стала спакайней* і што *зьявілася магчымасьць* творчай і рэальнай працы?.

Урад Пілсудзкага падняў на патрэбную вышыню аўтарытэт улады і гэта зрабіў ня толькі з пэўнай цьвёрдасьцю, але ясна і акрэсьляна зазначыўшы граніцы, ў якіх меншасьці, а ў тым ліку і Беларусы, могуць вясьці сваю культурную, грамадзкую і палітычную працу. І зноў-жа, ці-ж пры папярэдніх урадах магла гэтак хутка ісьці наперад беларуская культурная і ґрамадзкая праца, як ідзе сяньня?

З чым-жа *мы* — беларускія нацыянальныя групіроўкі, перажыўшыя гэткі цяжкі 1926 год і год жмуднай працы ў 1927 годзе, ўступаем у Новы 1928 Год?

З вялікім моральным задаваленьнем мы можам сказаць, што ў гэты год мы ўступаем ня толькі поўныя веры, але *сьвядомыя ўжо сваей нацыянальнай магутнасьці!* Сяньня ў пярэдадні Новага Году прышоў з далёкай вёскі Слонімшчыны пратокол аб паўстаўшым новым 117 аддзеле „Прасьветы„! А слабенькая яшчэ год назад сама „Прасьвета" мае каля 4,000 сябраў 84 бібліатэкі, 12 тэатральных групаў, 4 нацыянальных хора і г. д. Ці-ж гэта не вялікая перамога нацыянальнай ідэі, вялікі пасьпех нашай ідэолёгічнай і тактычнай лініі? А разам ці ж гэта ня ёсьць доказам таго, што беларуская *культурна-асьветная праца* пры *ўрадзе Пілсудзкага мае ўсе магчымасьці* да свабоднага разьвіцьця?

Лік сябраў *першага* „Беларускага Камітэту па справам Самаўрадаў" даходзіць да 200 і стала павялічваецца! Ці гэта ня ёсьць доказам, што сьвядомая лепшая частка Беларускага Грамадзянства разумее, *дзе* ляжыць шлях беларускай творчай працы на самаўрадавым грунце!

Гэты Камітэт даў беларускаму сялянству 5 войтаў — шчырых, сьвядомых першых беларускіх войтаў! І мы пэўны, што дасьць іх яшчэ шмат!...

Нарэшце тысячы лепшых. найбольш сьвядомых і адданых справе Беларускага адраджэньня сябраў гуртуецца каля таго Бела-Чырвона-Белага сьцягу, які высока трымае Беларуская Нацыянальная Рада і Партыя!..

Дык, уступаючы у Новы 1928 Год, мы ідзем у яго з вялікім моральным задаваленьнем і констатуем, што надзеі нашыя на Беларускі Народ не прапалі і цяжкая, часта гэтак горкая праца нашая дала вялікія рэзультаты! А для Новага 1928 Году мы ставім найлепшы гороскоп, бо вышаўшы пасьля хістаньняў на роўную правідловую дарогу— Беларускі Народ у 1928 годзе бязумоўна здабудзе яшчэ больш пасьпехаў, выкажа здольнасьць да яшчэ больш значных чынаў!

А першым гэтым чынам будзе выдзяленьне праз Народ *новага парляменцкага прадстаўніцтва.* Мы пэўны, што Народ Беларускі у новы Сойм і Сэнат пашле сьвядомых, шчырых і *дакаваўшых* адданьне яму сваіх лепшых сыноў!

Ставячы найлепшы гороскоп на Новы Год і констатуючы паступовую направу варункаў жыцьця Беларусаў за год папярэдні— мы лічым сваім абавязкам прынясьці падзяку і выказаць глыбокую пашану *таму чалавеку, які даў магчымасьць* гэтых пасьпехаў асягнуць і гэты гороскоп цяпер ставіць. Дык, жадаючы усяго лепшага у Новым 1928 Годзе усяму Беларускаму Народу, мы адначасна жадаем у Новым Годзе здароў'я і пасьпеху у ягонай працы Правадыру Польскага Народу Маршалку Пілсудзкаму!

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Мінуўшы год прайшоў у эўрапэйскай палітыцы пад знакам кансалідацыі і заміраньня. У многіх мясцох, як на Блізкім Усходзе, на Балканах, на італьянска-францускай і польска-літоўскай граніцы, ужо насьпевалі паважныя канфлікты, але дзякуючы інтэрвэнцыі вялікіх дзяржаваў пашанцавала безхваробна зьліквідаваць іх. Іншае пытаньне, ці на доўга.

Сытуацыя на Балканах усё застаецца нявыразнай і няпэўнай. Адносіны між Югаславіяй і Італіяй ўвесь год былі напружаны і новы год наступае тут пад знакам поўнай няпэўнасьці. На сэрбска-францускі трактат дружбы Італія адказала гэткім-жа крокам у адносінах Албаніі. І тут па старому стаяць дзьве варожыя друг другу стараны, гатовыя ў кожную хвілю ўхапіцца за аружжа для папіраньня сваіх мэтаў. Аб поўнай няпэўнасьці сытуацыі на Балканах прыходзіцца гаварыць дзеля таго, што няўхілены ні адзін з чыньнікаў непакою.

Македонскае пытаньне ня вырашана і Італія не адракаецца ад экспансыі на Усход.

Гэтак сама і ў адносінах Італіі з Францыяй не наступіла радыкальных перамен дзеля таго, што Італія выразна выступіла на шлях пашырэньня сваіх уплываў на Блізкім Усходзе і паўночнай Афрыкі. Сярódземнае мора хавае ў сабе шмат неспадзяванак, якія могуць наступіць, як марская бура па першаму ветру з італьянскіх берагоў. Чыньнік непакою тут крыецца галоўным чынам у перанаселеннасьці Італіі, спыненьні яе эміграцыі і бязупынным узбраеньні на сушы, на моры і ў паветры.

Адначасна прыходзіцца констатаваць

значнае палепшаньне адносінаў між Нямеччынаю і Польшчаю.

Пасьля 2-х гадовай таможнай вайны, аднолькава руйнуючай для абедзьвюх старонак Нямеччына першая пайшла на ўступкі. Распачаўшыяся польска-нямецкія гандлёвыя перагаворы на гэты раз гарантуюць памысны вынік. Па некаторым пытаньням ужо дасягнута згода. А эканамічная згода найлепш уплыне і на палітычныя адносіны. Адзнакаю палепшаньня адносінаў на рубяжы між Усходняю і Заходняю Эўропаю служыць амэрыканска-англійская пазыка Польшчы, якая у праціўным выпадку ня была-бы рэалізована. Капіталістыя пры няпэўнасьці сытуацыі не зарызыкуюць зьмясьціць свае капіталы. Стопень даверра фінансавага сьвета служыць лепшым барометрам палітычнага палажэньня. У даным выпадку рашучую ролю адыграла двулікая палітыка Нямеччыны пры адначаснай няпрымірымасьці саветаў, аканчальна адштырхнуўшыя Англію ад сябе і прымусіўшы ісьці на згоду і падтрыманьньне Польшчы, як паважнага ваенна-палітычнага фактара між Бэрлінам і Масквою.

Каб скончыць з падзеямі Заходняй Эўропы за мінуўшы год, трэба застанавіцца яшчэ на Жэнэве, як мейсцу міжнарадовых гутарак. Пры гэтым трэба адцяніць марскую конфэрэнцыю „трох" г. з. Амэрыкі, Англіі і Японіі, якая не дала ніякіх вынікаў. І пытаньне аб межаваньні ўзбраеньня ці поўным разаружэньні на моры пакуль стаіць адчыненым. А гэтым часам Амэрыка, маючая неабмяжованыя грашовыя сродкі і калясальную тэхніку, на гвалт будуе новыя крэйсары, мінаносцы і падводныя лодкі, каб з часам стаць першаю ваенна-марскою дзяржаваю, прымушаючы гэтым сваіх канкурэнтаў не адставаць.

Гэтак сама і дзьве конфэрэнцыі, пасьвядчоныя разбраеньню на сушы, не далі ніякіх вынікаў, апрача новага доказу неразрашымасьці гэтай проблемы. Хіба новым мамэнтам у гэтым зьяўляецца ўдзел савецкай дэлегацыі, якая сваім провакацыйна дэмагогічным выступленьнем толькі затрудніла міжнарадовую працу ў гэтым кірунку. У той час, як Літвінаў прапанаваў у Жэнэве свой правакацыйны плян поўнага разбраеньня, Рыкаў у Маскве заявіў, што праз 8 месяцаў Радавая Расея будзе мець самы магутны ў Эўропе паветраны флёт. Праўда ніхто паважна гэтай брахні маскоўскіх банкротаў трактаваць не стане. Але гэта найлепш характэрызуе двулічча савецкай палітыкі, якая заўсёды скіравана да таго, каб толькі сварыць народы і клясы між сабою і вытвараць ня мірную атмасфэру, якой жадае змучаны сьвет, а спрыяючую выбуху вааружоных канфліктаў.

Гэтая бальшавіцкая тактыка найлепш уяўнілася ў Кітаі, дзе перад Новым Годам зноў наступілі паважныя перамены. Бальшавікі ня могуць абайціся без таго, каб не атрымаць апляухі. Пасьля гэткай апляухі, атрыманай ў Пэкіне ад Чанг-Тса-Ліна і ў Лёндане, здаецца, можна была-бы хоць хвілёва супакоіцца і хоць задавольніцца тым, што у Паўднёвым Кітаі іх яшчэ церпяць. Дык не-ж. Ім трэба было падбухторыць частку работнікаў у Кантоне, каб прадэманстраваць перад сьветам, што яны яшчэ маюць уплыў у Кітаі і што надзея на рэвалюцыю ня згублена. Але заўсёды падобныя бальшавіцкія экспэрымэнты канчаецца зусім адваротнымі і непажаданымі для іх вынікамі. Апошнія падзеі ў Кантоне яшчэ лішні раз сьведчаць аб тым, як агідны камунізм для кітайскага народу. На ўсялякую бальшавіцкую правакацыю кітайскі народ рэагуе самымі рашучымі контр-мерамі, не застанаўліваючыся ні перад якімі скуткамі. На спробу камуністычнай рэвалюцыі ў Паўднёвым Кітаі кітайцы адказалі масавым тэрорам проці кітайскіх камуністаў і маскоўскіх агэнтаў. Камуністыя мардуюцца на вуліцах без усялякага суда, як сабакі, ня выключаючы і расейскіх бальшавікоў. Апрача таго дыктатар Паўднёвага Кітаю гэн. Шэк, зноў узяўшы ўладу ў свае рукі, зарваў адносіны з Масквою і закрыў усе савецкія консульствы. Гэта найлепшы навагодні падарунак бальшавікам ад Кітая, на які яны пакладаюць свае апошнія надзеі.

Калі да гэтага яшчэ дабавім тое, што барацьба між сталінцамі і апазыцыянэрамі ў Расеі ня толькі ня спынілася, а з кожным днём прыймае ўсё большыя і большыя разьмеры, дык будзем мець лепшы малюнак з аднаго боку поўнага банкруцтва савецкай міжнарадовай палітыкі ў мінуўшым годзе і з другога боку поўны развал камуністычнай партыі, які ідзе ўперад шпаркімі крокамі. Гэта адна з найбольшых заслугаў мінуўшага году перад чалавецтвам і сучаснаю культураю.

N.

Цэнтральны Агульна-Беларускі Народны Выбарчы Камітэт.

На конфэрэнцыі прадстаўнікоў беларускіх палітычных і грамадзкіх арганізацыяў, якая адбылася у дні 26 і 27 сьнежня г. г. у Вільні, зарганізаваны

ЦЭНТРАЛЬНЫ АГУЛЬНА-БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ВЫБАРЧЫ КАМІТЭТ.

Да Камітэту увайшло 5 сябраў з цэнтру і 30 з правінцыі, з якіх 20 зьяўляюцца раднымі. Камітэт распачаў сваю дзейнасьць і працуе ад 9—20 гадзіны. Прыяджаючыя сябры з правінцыі могуць затрымацца і пераначаваць у памешканьні Камітэту.

Адрэс; **Вільня, Завальная, 6 — 4.**

Перад выбарамі да Сойму і Сэнату.

ЛІСТ СТАРШЫНЯЎ АКРУЖНЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЯЎ.

Гэнэральны выбарчы камісар на ўнёсак адносных старшыняў апэляцыйных судоў вызначыў наступных старшыняў акружных выбарных камісіяў (на Усходніх Крэсах).

Округ № 59 (Брэст-Літоўскі): старшынёю — Залуско,міравы судзьдзя, заступнікам — Дмоўскі, мір. судзьдзя.

Округ № 60 (Пінскі) — старшынею — Рэут, судзьдзя акр. суда, заступнікам—Нагуйеўскі, судзьдзя акр. суда.

Округ 61 (Навагрудак) — старш. Парфяновіч, судз. акр. суда, заступнік — Наркевіч — Іодзько, судзьдзя акр. суда.

Округ № 62 (Ліда) — старш. Ловіч-Бараньскі мір. судзьдзя, заступнік Шчэнсновіч, мір. судзьдзя.

Округ № 63 (Вільня) старшыня Дмохоўскі, судзьдзя апэляцыйнага суда, заступнік — Венцковіч.

Округ № 64 (Сьвенцяны) — старш. Ільяшэвіч, мір. судзьдзя, заступнік — Кухэньскі, мір. судзьдзя.

ЗАКОН АБ СВАБОДЗЕ ПЕРАДВЫБАРЧЫХ САБРАНЬНЯЎ.

Ніжэй зьмяшчаем пўоны тэкст закону ад 5 жніўня 1922 г. аб свабодзе перадвыбарчых сабраньняў. Закон гэты акрэсьляе правы кожнага грамадзяніна і кожнай грамадзкай групы. Гэтаму праву адказваюць акрэсьляныя правы і адміністрацыйных уладаў. Усякі закон трэба ведаць і разумець. Няма лепшага спосабу барацьбы з надужыцьцямі, як ласьне дакладнае знаньне правоў, заключаных у абавязуючых законах.

Рэд.

1 пар. Усе сабраньні, скліка
ныя выбаршчыкамі, ці кандыдатамі на паслоў у выбарчым пэрыядзе, г. зн. ад дня вызначэньня тэрміну выбараў да дня выбараў не патрабуюць дазволу адміністрацыйных уладаў.

2 пар. Аб перадвыбарчым сабраньні на дарогах і публічных пляцах павінна быць паведамлена асобаю, склікаючаю сабраньне, адпаведным адміністрацыйным уладам I інстанцыі ці бліжэйшаму паліцыйнаму пастуне пазьней, як за 24 гадзіны да пачатку сабраньня.

3 пар. Паведамленьне, ўказанае ў 2 пар. можа быць пісьменнае ці вуснае і павінна заключаць у сабе: 1) імя і фамілію склікаючага, 2) заяву, што сабраньне гэта перадвыбарчае, 3) адрэс склікаючага. Улады той час выдаюць пасьведчаньне ў прыняцьці паведамленьня аб сабраньні.

4 пар. Указаныя ў 3 пар. паведамленьне і пасьведчаньне звальняюцца ад усялякіх гэрбавых аплатаў.

5 пар. Закон гэты не сьцясьняе нічым сабраньняў у закрытых памешканьнях, прычым двор і агародчык, складаючыя арганічнае замкнутае цэлае з гмахам, лічацца памешканьнем замкнутым.

6 пар. Усе пастановы папярэдніх загадаў, пярэчачыя гэтаму закону, трацяць сваю праўную сілу.

7 пар. Закон гэты ўступае ў жыцьцё з днём яго апублікаваньня, а выкананьне даручаецца Міністру Унутраных Справаў.

Вынікі мінуўшых выбараў з Усходніх вакругоў.

Дзеля надходзячых новых выбараў прыпамінаем вынікі выбараў да мінуўшага Сойму, якія адбыліся 5 лістапада 1922 г.

ВІЛЬНЯ.

Места і павет 5 мандатаў. Дзяліцель выбарчы складаў 13,014.

Польскія Эндэкі і Хадэкі: 2 мандаты (паслы Зьвержынскі і кс. Ольшанскі). Галасоў — 32,031.

Пяст: 1 мандат (пас. полк. Вендзягольскі, каторы потым выступіў з партыі). Галасоў — 16,555.

Вызваленьне: 1 мандат (пасол Косьцялкоўскі, які цяпер стаіць на чале Партыі Працы). Галасоў — 13,555.

P. P. S. — 1 м. (пас. Ст. Плаўскі). Галасоў — 13,064.

СЬВЕНЦЯНЫ.

Паветы: Сьвенцяны, Браслаў, Паставы, Дзісна — 6 мандатаў, дзяліцель выбарчы 14,183.

Вызваленьне: 4 мандаты (паслы Галка. Адамовіч, Пятроўскі і Шапель). Гал.—56,732

Блёк Нац. Меншасьцяў (16)—2 мандаты (паслы кс. Станкевіч і Мятла). Гал. — 36,609.

ЛІДА.

Паветы: Ліда, Валожын, Ашмяны, Маладэчна, Вілейка — 7 мандатаў. Выб. дзяліцель — 17,222.

Вызваленьне — 3 м. (паслы Ваявудзкі, Галавач, Балін). Гал. — 51,668.

Бл. Нац. Менш. (16) — 2 мандаты (беларусы Аўсянік і Рак-Міхайлоўскі). Гал. — 40,677.

Пяст — 1 м. (пас. Дуброўнік). Гал. — 34,344.

Эндэкі і Хад. (8) — 1 м. (пас. Рачкоўскі). Гал. 13,112.

НАВАГРУДАК.

Пав. Навагрудзкі, Столпцы, Нясьвіж, Баранавічы, Слонім — 6 мандатаў. Выб. дзяліцель 14,951.

Шаснастка — 4 мандаты (паслы: Кахановіч і Рагуля — беларусы, Выгодзкі—жыд і Люблінскі).

Вызваленьне — 2 м. (паслы Гэльман і Шакун). Гал. — 41,251.

ПАЛЕСЬСЕ.

Паветы: Пінскі, Лунінец, Сарны, Мандатаў — 5. Выб. дз. 17,667.

P. P. S. 3 мандаты (паслы Воліцкі, Бадзян і Дзенгілеўскі). Гал. — 52,981.

Шаснастка — 1 м. (пас. Ярэміч). Гал.— 31,974.

Вызв. — 1 м. (пас. Королеўскі). Гал. — 26,925.

БРЭСТ-ЛІТОЎСКІ.

Паветы: Кобрын, Пружаны, Косаў, Драгічын, Камень-Кошырскі. Мандатаў— 5. Выб. дз. 13,598.

Шаснастка 3 м. (паслы Дзьмітрук, Хруцкі і Мінзвера). Гал. — 44,805.

Сацыялісты — 1 м. (пас. Узэмбло). Гал. 20,746

Вызваленьне — 1 м. (пас. Бон.) Гал. — 13,598.

ПАЗЫЦЫЯ ЖЫДОЎСКІХ КУПЦОЎ.

Жыдоўскія купцы пастанавілі высунуць уласны выбарчы ліст дзеля таго, што апынуліся ў вельмі труднай сытуацыі: ня могуць ісьці з „Агудаю", бо мелі-бы проці сябе блёк меншасьці і ня могуць ісьці з блёкам меншасьці, бо мелі-бы проці сябе „Агуду" і баяцца рэпрэсыяў у віду надходзячага выкупу прамысловых патэнтаў і падатковых льготаў.

БЛЕК САЦ. НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

Стварыўся блёк сацыялістычных нацыянальных меншасьцяў, у які уваходзяць жыдоўскія сацыялістыя, Бунд, Поалей-Сіён, лявіца, сац. нямецкія і некатарыя групы сацыялістаў славянскіх. Блёк будзе падтрымліввацца польскімі сацыялістамі. Ліст блёка пойдзе пад № 4.

БОЛЬШАСЬЦЬ УКРАІНЦАЎ ПРОЦІ БЛЕКУ МЕНШАСЬЦЯЎ.

Да блёку нацыянальных меншасьцяў з украінскіх палітычных групаў далучылася толькі гэтак званая У. Н. Д. О. (украінскае нац, дэм. аб'еднаньне). Партыя гэта раней сьцьвярджала, што рэпрэзэнтуе ў перагаворах у справе блёку цэлы украінскі народ. Аднак-жа хутка высьвятлілася, што У.Н.Д.О стаіць зусім асобна між рэштаю украінскіх палітычных групаў з вялікімі ўплывамі, якія пасьля перагавораў рашылі не далучацца да блёку меншасьці.

Цяпер ужо зусім пэўна, што да блёку не далучаецца ні лявіца „Сель-Роб." (крэўная па ідэалёгіі з беларускаю грамадою), ні правіца, ні гэтак званая партыя радзікальных сацыялістаў, якая згрупавалася з гэтак званаю палітычнаю групаю „Вперед", ні група б. пасла Васільчука гэтак зв. „Сель-Саюз", ні „Партыя Працы", ні, нарэшце, полёнофільская група У. Н. С. Адсюль відаць, якая дробная частка ўкраінцаў далучылася да блёку меншасьцяў, які сярод украінскага грамадзянства, як і сярод жыдоўскага цяпер не карыстаецца ніякай папулярнасьцю.

„Дзеяч" і судовы абаронца А. Міткевіч у сьветле дакумэнтаў.

Копія з копіі.

Пераклад з польскага.

ПРАТАКОЛ

Паседжаньня Ураду Беларускага Т-ва Дабрачыннасьці ў Горадні, дня 6 лістапада 1924 г.

(Выпіска).

На дзенным парадку:

1. Пратакол Рэвізыйнае Камісіі Т-ва Дабрачыннасьці. Пастанавілі: Пасьля аглядзеньня пратаколу Камісіі і разгледжаньня супольна з Камісіяй паданых фактаў **признаць факт надужыцьця, дапушчанага б. скарбнікам А. Міткевічам праз прысваеньне грошаў атрыманых з розных крыніцаў на утрыманьне і харчаваньне беларускага прытулку у Горадні** пры Мастовай вул. № 9 у суме прыблізна **тысяча сто злотых** і з мэтай праверкі рахункаў, якімі вырахоўваецца п. Міткевіч, затрэбаваць ад яго усялякія рахункі і канцэлярыю, якія на жаданьне Ураду п. Міткевіч аддаць станоўча ня хоча.

2. Аб быўшым скарбніку Т-ва А. Міткевічу.

Пастанавілі: Бяручы пад увагу, што п. Міткевіч узяўся быць ня толькі скарбнікам Т-ва, але і наагул кіраўніком і адказным за ўвесь парадак у канцэлярыі прытулку, і за цэласьць маемасьці прытулку за што і карыстаўся з бясплатнага памешканьня з 3 пакояў, кухні і кладоўкі, з электрычным сьветам, апалам і вадой — наадварот— дапусьціў надужыцьці: а) **прысваеньне грошаў, прызначаных на утрыманьне дзяцей прытулку, b) штучнае перагрупаваньне ў Урадзе, c) машэнства, d) штучнае павялічаньне ліку дзяцей прытулку на прыпадак якой небудзь рэвізыі, зьбіраючы зусім чужых дзяцей, якія не належаць да прытулку і выдаючы іх за дзяцей прытулку.**

Выключыць п. Міткевіча з ліку сябраў ня толькі Ураду, але з сьпіскаў Т-ва Дабрачыннага, аддаць яго у рукі уладаў і суду і высяліць з памешканьня.

3. Аб самавольным прысваеньні фартэпьяна — пьяніна, належачага да прытулку.

Пастанавілі: Пасьля высьненьня аказалася, што фартэпьяна стаяла ў пакоі б. кіраўніка прытулку Дыбоўскай — яго швагеркі, і што фартэпьяна было вынясяна з пакою кіраўніка з яго веды а гадз. 10 увечары **і фартэпьяна было памешчана ў прыватным памешканьні А. Міткевіча бязпраўна, а на жаданьне зьвярнуць яго п. Міткевіч катэгарычна адмаўляецца — зьвярнуцца да п. Пракуратара аб прымусовым звароце фартэпьяна.**

4. Адмова п. Міткевіча аб выдачы Ураду дакумэнтаў і канцэлярыі.

Пастанавілі: **Зьвярнуцца да п. Пракуратара.**

Падпісалі: Старшыня Ураду
(—) *Я. Шурпа.*

Сябры: (—) *Лукашык*, (—) *Аршун*—кіраўнік прытулку, (—) *Л. Рах*, (—) *Іваеў*, сэкрэтар (—) *Самуйловіч.*

За згоднасьць з арыгіналам
(—) *Лукашык.*

(м. п.)

Арыгільная копія пратаколу з падпісамі, пячаткай Дабрачыннага Белар. Т-ва у Горадні, знаходзіцца у рэдакцыі.

Пераклад зроблены літэральны, з захаваньнем стылю зьместу.

Ад Рэдакцыі: За гэтую справу А. Міткевіч потым быў пасаджаны ў вастрог як мы падалі ў папярэднім нумары „Бел. Сл."

Пісьмо у рэдакцыю.

У зьвязку з артыкулам, надрукованым у „Бел Слове" (№ 39) пад загалоўкам „Прайдзісьвет", А. Міткевіч выдрукаваў у сваім бруковым сьвістку, які ён выпускае ў Баранавічах пад гучнай назвай „Самаўрад",—пісьмо поўнае лаянкі і інсынуацыяў па майму адрэсу.

Прынцыпова з тыпамі падобнымі А. Міткевічу я не палемізую, бо лічу гэта ніжэй майго гонару, і то з повадаў, якія высьвятляны дакладна ў тым-жа артыкуле „Прайдзісьвет", а яшчэ ляпей у друкуямым сяньня пратаколе горадзенскага прытулку!

Аднак-жа з тае прычыны, што апошнія часы ў зьвязку з выбарчай барацьбою ня толькі грамадаўскія газэты, а і „Бел. Дзень" пана Францішка Умястоўскага гэтак моральна заняпаў, што гасьцінна дае прытулішча ўсялякім бруцам цёмных асобаў, якія ў палітычнай барацьбе з Бел. Нац. Радай выліваюць як на мяне, так і на асобаў, якія знаходзяцца з нашымі арганізацыямі ў кантакце, паскудная „карэспандэнцыя" аб радным беларусу з Баранавіцкага магістрату п. Яроцкім і ілжывае пісьмо грамадаўца Казюкевіча („Бел. Дзень" № 39 і № 40), спадзяюся, што і гэтае пісьмо Аўгэна Міткевіча магло-бы знайсьці гэткі-жа гасьцінны прытулак. Дык мушу заарэгаваць, каб адцеміць усю гнюсную ілжу гэтага Аўгэна Міткевіча.

Аўгэн Міткевіч піша, што „я" ніколі ня быў доктарам, а толькі вучням Магілеўскай фэльдшарскай школы"...

Што я быў доктарам 8 гадоў—3 гады на вайне ў чырвоным крыжу, 1 год пры бальшавікох у Слуцку і 4 гады на польскай паньствовай службе, аб гэтым знаюць тысячы асобаў! Аўгэн Міткевіч проста паўтарыў гнюсную сплетню, якую два гады таму пусьціла Луцкевіча „Бел. Справа" і якая мною была спраставана ў віленскім „Słowie". Роўным чынам ёсьць у Польшчы сотні людзей, якія помняць мяне па Менску вучням гімназіі, а потым студэнтам Ваенна-Мэдыцынскай Акадэміі. Аўгэн Міткевіч проста злосна спутаў мяне з маім аднафамільцам фэльчарам (запраўды скончыўшым магілеўскую школу!) Васілем Фамічом Паўлюкевічам, пражываючым і цяпер у Слуцку (па чуткам В. Ф. Паўлюкевіч скончыў бальшавіцкі унівэрсытэт і ўжо доктар).

Далей Аўгэн Міткевіч піша, што яго ў турму ўпакавалі „Паўлюкевічаўцы"... і што „аніякай віны ён ня меў"... і што „Паўлюкевіч выдаваў спэцыяльныя пасьведчаньні сваім агэнтам, каторым даручаў сачыць за беларускімі дзеячамі і аб усіх кроках тайна данасіць"...

Хто ўпакаваў у турму Аўгэна Міткевіча, цае найлепшы адказ зноў жа пратакол Дабрачыннага Т-ва! Гэты пратакол роўным чынам даказвае і „ягнячую нявіноўнасьць" Аўгэна Міткевіча!...

Далей пасьля таго, як я пэрсанальна усунуўся з выбарчай акцыі ў 1922 годзе, хаця мне 16-ка прапанавала пэўны мандат з Наваградчыны (другое, а потым нават першае месца!), я ніякай палітычнай акцыі ня вёў, а выключна займаўся практыкай у Сіняўцы ажна да восені 1924 году. Дык абсалютнаю брахнёю ёсьць заява Аўгэна Міткевіча, што я ў Берасьці ў 1923 годзе „прадаваў сваю арганізацыю"!

З нябошчыкам Б. Савінкавым кантакт меў і гэтага ня скрываю, але гэты кантакт быў выключна баявога характару на грунце антыбальшавіцкай актыўнай працы. Было так, што паміж расейскай баявой арганізацыяй і беларускай гэткай-жа баявой арганізацыяй быў падпісаны дагавор, як роўны з роўным. Гэта быў баявы саюз: Расейцаў, Украінцаў, Беларусаў, Данцоў, Кубанцаў і нават Карэлаў. Абсалютна ніякіх грошаў ані арганізацыя мая, ані я асабіста ад Савінкава не атрымлівалі. Кантакт быў сорваны з тае прычыны, што да арганізацыі Савінкава прымяшаліся проціў нашай згоды беларускія эсэры, з якіх адзін (Злоцкі) здрадзіў нашыя пляны менскім беларусам на конфэрэнцыі ў Празе Чэскай. Аднак-жа арганізацыя нашая зноў самастойна існавала і далей, як беларуская баявая канспіраціўная і незалежная, за што ў 1922 годзе ў траўні месяцы я і некаторыя сябры гэтай арганізацыі былі арыштаваны. Усё гэтае, я пэўны, могуць у любую хвілю сьцьвердзіць беларускія дэлегаты на Праскую конфэрэнцыю п. п. Аляксюк і Курыловіч, як і многія іншыя.

Думаю, што пасьля гэтых высьвятленьняў кожнаму чэснаму чалавеку стане ясна ўся гнюснасьць ілжы і інсынуацыяў Аўгэна Міткевіча, ня лічучы бруковай лаянкі. А для таго, каб і Аўгэну Міткевічу гэта стала ясна, я адначасна з гэтым цягну яго да судовай адказнасьці па абвінавачаньню ў інсынуацыі і дыфамацыі. А з другога боку хаця артыкул „Прайдзісьвет" не падпісаны, але за яго, паводле дэкрэту прэсавага, адказваюць (калі б там было-бы хаця слова няпраўды!) як адказны рэдактар Т. Вернікоўскі, так і я, як галоўны рэдактар і выдаўца „Бел. Слова".

Але Аўгэн Міткевіч ня зьбіў аніводнага закіду з гэтага артыкулу ў сваей сыстэматычнай цёмнай і здрадніцкай працы і, зразумела, выкарыстаць свае права пацягнуць п. Вярнікоўскага і мяне да адказнасьці пэўне не захоча!... І з тае простае прычыны, што як усё тое, што пададзена ў артыкуле „Прайдзісьвет" так і ў пратаколе Дабрачыннага Таварыства ёсьць чыстая праўда!

А. Паўлюкевіч.

Раяшнік.

(Навагоднія вітаньні і рожныя пажаданьні).

Паважаныя паны і паночкі, і былыя паслы галубочкі, і ад палітыкі рожнай дзеячы, і па сьвету ўсяму тулячы — беларускія нашы эсэры, і паненкі, і ўсе кавалеры, і войты і радныя гмін, і „Прасьвета“, і сябры камітэта нашага „Самажондовага“, пакуль яшчэ новага хоць гэта для ўсіх і навінка, што „шэйнэ“-мая — „катарынка“ вось з гэткім падходам, віншуе ўсіх з Новым ужо Годам!

Хай ў гэтым ўжо навагоднім „акрэсы“ палепшацца ўсіх інтарэсы.

І надайшоўшы Новы ўжо Год пазбавіць усіх нас клапот жыцьця нашай нядолі.

Каб сварыцца было-бы даволі.

Каб лепшыя ўсе кандыдаты адтрымалі-б мандаты.

І на карысьць для Народа запанавала-бы згода.

Каб школы свае-бы былі.

Каб зямлі-бы ўсім надалі.

Каб падатковыя ўсе „zaległości“ „umorzyła“-бы Улада бяз злосьці...

А мы сьведкамі пры ўсім тым-бы былі і гарэлку-бы з вамі пілі...

——••——

І „мэтранпаж“ і паны друкары — над газэтай ўсей главары — і Баеўскі, ўласьнік друкарні, хай будзе ў вас цёпла, нібы ў пекарні.

Хай пануе паміж вамі спакой.

І не рабілі-б вы часта „настрой“.

А „Беларускае Слова“ на гэта, хай плаціць заўсёды, як выйдзе газэта...

——••——

А для „Беларускай Хаткі“, каб не націскалі-б падаткі.

І „według“ „акульнікаў“ пазбавіліся-б спульнікаў — ціхіх, як той казаў, не „аратараў“, а рожных там сэквэстратараў“!

Каб яны ўжо „Хатцы“ ня шкодзілі, і справы ўсе залагодзілі не „экзэкуцыйным“ парадкам, а згодным уладкам!

І нарэшце адно пажаданьне „рабром“ — каб „публіка“ да вас-бы „валіла валом“...

А Адаму з Рагуляй, з Яромам — з „хадэцыяй“ і з ўласным „нацкомам“, — каб справы пайшлі-бы так гладка, і стварылася зноў-бы „шаснастка“, і галасамі вось гэтай „мнейшосьці“ папалі-бы ў Сойм ужо, як... госьці.

А „Спадару“, і злева і зправа... тая самая хай будзе ўжо слава...

——••——

Вось з „Бел-Дня“ паночкам, залатым грабушочкам, дык трэба трымацца, каб зноў у „прасак“ не папасца, бо „краёвую“ цягнуць ужо „ношу“—ўсё роўна, што сесьці у калёшу.

Хай пухам-жа будзе вам гэтая ноша, а мейсца спачынку... калёша...

——••——

А „Праўдзе“, ці „Справе“, ці „Працы“ — паменьшыць-бы злосьці, каб перамывала-б свае ўжо косьці.

А для лепшага тона вярнула-б Антона, ў хуткім-бы часам і іншых з Тарасам...

——••——

Пад гэтыя вось пажаданьні забыўся аб іншым пытаньні, — аб вёсцы, дзе трасца трасе і ў перапалоху ўсе: адных „рэвізуюць“, другіх арыштуюць, і як з цёмнага бору на‘т без разбору...

Ці ведама ў уладах аб гэтых прыкладах ганебных і нікому зусім не патрэбных?...

І ў нас, як казаў, з-за мандата ўжо пачалі „калашмаціць“ брат—брата.

Бо ўсе аматары ў паслы, дый у сэнатары!

Тутака партыі, тамака сьпіскі... А ці будуць Народу тут „зыскі“?!.

Бо кожны да сябе заклікае...

Вось тут-та і ёсьць запятая?!...

Але годзе, паночкі, ўжо годзе?! Бо ў беларускім Народзе ўжо вочы даўно прасьвятлелі і клопатаў з вамі даволі ўжо мелі!..

Даволі яго вы муцілі, і ў мутнай вадзіцы мандаты лавілі!...

Шэйнэ-Катарынка.

КАМУНІСТЫЯ ПОЙДУЦЬ САМАСТОЙНА.

Камуністыя пастанавілі высунуць у часе выбараў свой ўласны ліст, які магчыма будзе ўневажняны галоўнаю выбарчаю камісіяй. Адначасна вядуцца перагаворы між радам сацыялістычных групаў, якія адкалоліся ад P. P. S., з мэтаю стварэньня супольнага блёку з незалежных сацыялістаў (Дробнэраўцоў) і лявіцы P. P. S.

ЖЫДОУСКАЯ ПРЭСА АБ БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯУ.

Найбольш распаўсюджаная ў Польшчы жыд. варш. газ. „Der Moment“ ад 23 сьнежня піша, што сытуацыя блёку нац. меншасьцяў вельмі дрэнная. Сярод паасобных меншасьцяў пануе вялізарная нязгода, ў выніку чаго меншасьці гэты могуць атрымаць менш мандатаў, чым калі-б кожная з іх шла на выбары асобна. Найбольшая меншасьць у Польшчы — украінцы разьбіты на 15 партыяў групаў, якія адчаяпна боруцца адна з другою і з якіх да блёку прылучылася толькі адно „Ундо“ Партыя гэта мае найбольшы уплыў у Усх. Галіцыі, але там жыды не належаць да блёку нац. меншасьцяў. На Валыні дзе жыды і украінцы маглі-бы шмат друг другу памагчы, зноў маюць уплыў тыя украінскія групы, якія ня уваходзяць у блёк нац. меншасьцяў. Ня менш хаос і разлад пануе і сярод беларусаў. Немцы гэтак сама не салідарны, бо нямецкія сацыялістыя маюць замер злучыцца з P. P. S., якая гарантуе ім 3 мандаты замест 2, якія атрымалі-бы ў блёку нац. меншасьцяў. Сярод жыдоў ёсьць пакуль тры паасобных сьпіскі, але да 5 студня павінны наступіць далейшыя перамены, бо да гэтага часу жыдоўскія купцы і рамеслянікі адбудуць новыя нарады, на якіх вынясуць аканчальную пастанову адносна свaей пазыцыі.

З жыцьця нашых арганізацыяў

Беларускі Камітэт па справам Самаўрадаў.

Нясьвіж. На паседжаньні Сойміку старшыня Б. Камітэту па справам Самаўрадаў п. Я. Ярош запрапанаваў на пленуме Сойміка асыгнаваць сталую субсыдыю для Беларускай Клецкай Гімназіі, якую прапазыцыю ўнясьлі радныя беларусы клецкай гміны. Пасьля дыскусіі прапазыцыя была прынята. Аднак-жа з тае прычыны, што год бюджэтовы ўжо канчаецца, было асыгнавана пакуль што аднаразова 200 зл.

Сіняўская гміна.

Адбыліся перавыбары заступніка войта. Вялікай большасьцяй галасоў заступнікам войта аказаўся выбраным сябра Б. Камітэту па спр. Самаўрадаў радны п. Х. Шыбут. Шыбут падзякаваў за даверра сяброў радных і выбару ня прыняў, тлумачучы сваю адмову тым, што ўвесь вольны час аддае на беларускую грамадзкую, культурную і палітычную працу ў раёне больш шырокім, як гміна, дзеля гэтага ня можа быць заступнікам войта. На тым-жа паседжаньні на прапазыку Х. Шыбута Гмінная Рада ўхваліла асыгнаваць 400 зл. аднаразовай запамогі для Клецкай Беларускай Гімназіі.

Ад Рэдакцыі: Мы пэўны, што іншыя гміны па прыкладу Сіняўскай зробяць гэтак сама! Беларусы—Радныя, гэта ваш абавязак!

Т-ва „Прасьвета“.

За апошнія два тыдні былі заложаны гурткі „Прасьветы“ ў наступных мейсцах:

Вялейскі павет.

Вёска Муляры Вішнейскае гм., в. Золькі Вішнеўскае гм., в. Гарані Вішнеўскае гм., в. Папоўцы Войстамскае гм., в. Мачыцы Вязынскае гм.

Маладэчанскі пав.

Вёска Палікшты Ракаўскае гм., в. Гэрэлі Ракаўскае гм., в. Ракова ракаўскае гм., в. Бярозаўцы Гарадацкае гм., в. Душково Ракаўскае гм., в. Выганічы Ракаўскае гм., в. Перэжэры Ракаўскае гм., в. Юржышкі Ракаўскае гм., в. Вазгэлы Радашкоўскае гм. в. Сідораўцы Ракаўскае гм.

Валожынскі пав.

Вёска Кібуці Валожынскае гм. в. Юрацішкі Юрацісксе гм.

Нясьвіскі пав.

Вёска Лань Ланьскае гм.

Агульны лік гурткоў „Прасьветы“ дасягнуў 117.

Інтэрвэнцыя Бел. Н. Р.

У выніку інтэрвэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады перад Палескім Архіярэям у справе Дунайчыцкага магільніку зроблены Архіярэям загад аб спыненьні далейшай вырубкі лесу на магільніку.

Падзеі у Кітаі.

КРЫВАВАЯ БАНЯ ў КАНТОНЕ.

Пасьля захопа Кантона камуністы ўстроілі нябывалую разьню. Перабіта больш 20,000 кітайцаў і эўрапэйцаў. Затым выпусьцілі з турмаў каля 2,000 угалоўных праступнікаў, якія занялісь грабяжом і забойствам. На вуліцах разваліны спаляных дамоў і кучы трупаў замардаваных.

Вока за вока.

Пасьля паражэньня камуністаў у Кантоне распачалася расправа з імі. Большая частка камуністаў здоляла ўцячы з места. Пазастаўшыяся растрэліваліся на мейсцу бяз суда. Усе вуліцы запоўнены трупамі. У першыя два дні растрэляна больш 2,000 камуністаў. Кантонскі ўрад выпусьціў адозву, ў якой прапануе жыхарам выдаць усіх камуністаў пад пагрозаю растрэлу за хаваньне.

КАМУНІСТАМ ЗНОУ ГОРАЧА ў КІТАІ.

З Кантону паведамляюць аб небывалых рэпрэсіях проці служачых радавага пасольства. Арыштаваныя дзьве служачыя консульства былі растрэляны на мейсцу. З консульскага пэрсоналю растрэляна 2 камуністы і 5 іншых служачых, сярод якіх і віцэконсуль. Консул і 13 служачых арыштаваны. Западазроныя ў камунізме растрэліваюцца на вуліцах бяз суда. Усе кабеты з стрыжанымі валасамі растрэліваюцца, бо гэта лічыцца адзнакаю камуністычных пераконаньняў. У Ганконгу арыштавана каля 300 асобаў, з якіх 25 выбітных камуністаў. Усе яны будуць высланы ў Кантон. Гэтак сама арыштавана 200 бальшавікоў, у тым ліку гэнэральны савецкі консул з цэлым пэрсоналям у Шанхаю. З Токіо паведамляюць, што забойства віцэ-консула ў Кантоне можа пацягнуць за сабою пэважныя вынікі. Гаворыцца нават аб магчымасьці вайны.

САВЕЦКАЕ КОНСУЛЬСТВА--АРСЭНАЛ.

У савецкім консульстве ў Кантоне ў часе вобыску былі знойдзены гарматы і шмат усялякіх снарадаў. Консул і яго заступнік арыштаваны. Пастаноўляна канфіскаваць усе савецкія прадпрыемствы, знаходзячыяся ў Эўрапэйскім квартале і ўсіх савецкіх грамадзян высяліць.

Разьня у Кітаі.

З Ганконга паведамляюць, што камунізм, пасьля ліквідацыі ў Кантоне, пачаў разьвівацца ў рожных мейсцах правінцыі Шантунгу. Дзесяткі тысячаў уцекшых апавядаюць аб страшных сцэнах разьні і катаваньня, дакананых камуністамі. У Муілунгу замардавана 100 чалавек, Чысьпінгу—500, Гайфунгу 1,000 і Лукфунгу — 1,000. Лічба бежанцаў з правінцыі Чантунгу дасягае мільёна чалавек.

Адначасна паведамляюць з Кантону, што антыкамуністычны тэрор там прадаўжаецца. У працягу апошніх дзён там растрэляна 2,000 камуністаў. У часе вулічных баёў і бамбардзіроўкі разбурана 1,000 дамоў.

ТВАР КАМУНІСТАУ.

У правінцыях Гай-Фунг і Эу-Фунг, апанаваных пакуль камуністычнымі бандамі, чырвоны тэрор дасягнуў нябывалых разьмераў. Самазваныя улады выдалі дэкрэт, адмяняючы прыватную ўласнасьць. Камуністычныя банды грабяць дамы больш заможных асобаў, крамы і мардуюць людзей без разбору. Выданы дэкрэт, што хто мае маемасьць больш 25 даляраў, падляжыць растрэлу без усялякай віны разам з усім сямействам. Гэтай кары падляжаць і вучыцелі.

КІТАЙСКАЯ ТРАГЭДЫЯ.

Уцёкшыя з Кітаю да Японіі купцы апавядаюць аб няслыханай у гісторыі чалавечаства трагэдыі, якая цяпер разыгрываецца на кітайскай тэрыторыі. Дзесяткі сотні тысячаў спакойных грамадзян уміраюць ад голаду. Вайска незалажна ад таго, да якой партыі належаць, займаюцца грабяжом, паляць і мардуюць нават людзей. Ваенных пленных паддаюць няслыханым катаваньням: параць іх у кіпятку, праколываюць насы і вушы, абліваюць нафтаю і падпаліваюць, смажаць на вагні, як мяса і г. д. Адным словам Кітай, дзякуючы стараньням бальшавікоў, перажывае тое, што перажыла і перажывае яшчэ да гэтай пары Расея пад уладаю бальшавікоў.

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

Пасыуны гандлёвы балянс.

У лістападзе да Польшчы прывезена тавараў на сумму 155,581,000 залатых франкаў, а вывезена на 133,464,000 фр. Гандлёвы дэфіцыт складае 22,117,000 фр., ці 38 міл. злотых.

Пажар Дзікаускага палацу.

У ноч з 21 на 22 сьнежня згарэў ад нявыясьнянай прычыны замак графа Тарноўскага ў Дзікаве ў Усх. Галіцыі. Згарэла вельмі дарагая бібліятэка, складаючаяся з 20,000 тамоў і 8 чалавек у часе ратунковай акцыі. Уратавана толькі частка дарагіх рэчаў.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ГІДРА.

Па загаду судовых уладаў палітычная паліцыя ў Варшаве зьліквідавала 28 сьнежня агітацыйны аддзел Цэнтр. К-ту кам. польс. партыі, архіў і друкарню. Пры гэтым арыштавана каля 30 асобаў... Ліквідуюць, ліквідуюць цэнтральныя камуністычныя камітэты, а замест кожнага зьліквідаванага вырастае новы, як галавы ў гідры.

З ЗАГРАНІЦЫ.

САВЕЦКА-КІТАЙСКІ КАНФЛІКТ.

Савецкі гэнэральны консул падаў Нанкінскаму ўраду ноту Чычэрына, пратэстуючую проці зачыненьня савецкіх консульстваў у Палуднёвым Кітаі. З свайго боку Нанкінскі ўрад прадставіў прадстаўнікам дзяржаваў ноту, адхіляючую абвінавачаньні ў нарушэньні нятыкальнасьці савецкага консула. Зарваныя адносіны з Масквою могуць быць узноўляны толькі пасьля таго, калі бальшавікі перастануць умешывацца да ўнутраных справаў Кітая. Корпус консулаў даў сваю згоду на высяленьне савецкіх дыплёматычных урадоўцаў і канфіскацыю цэлай маемасьці савецкіх кансулятаў. Затым Нанкінскі ўрад заявіў, што выпусьціць на свабоду арыштаванага консула і служачых кансулятаў толькі пасьля таго, як Радавы ўрад выплаціць адшкадаваньне за шкоды, прычыняныя ў часе апошніх непарадкаў у Кантоне, з’арганізаваных савецкім консулам і афіцэрамі чырвонай арміі. Урад паўночнага Кітаю гэтак сама выслаў ноту ў Маскву, ў якой у вострай форме жадае спыненьня камуністычнай прапаганды пры пасрэдстві савецкіх кансулаў, паграджаючы ў праціўным выпадку зрывам дыплёматычных адносінаў.

Англія ня хоча размауляць з Саветамі.

З Лёндану паведамляюць, што Чэмбэрлен заявіў на запытаньне аднаго з паслоў парлямэнту, што ня бачыць ніакай магчымасьці вядзеньня далейшых размоваў з Літвінавым, пакуль адносіны ня зьменяцца каранным вобразам.

Францускія сацыялістыя на утрыманьні камуністау.

У Парыжу здарыўся вельмі цікавы выпадак. Левы сацыялісты Марэн забыў ў аўтамабілі партфэль, у якім знойдзены дакумэнты, сьведчачыя, што яго група адтрымлівала ад бальшавікоў грошы. Газэта „Популер“ паведамляе, што групе Марэна было выдана 100,000 фр. „Матэн“ наадварот сьцьвярджае, што выдаваліся значна большыя сумы: 370,000 фр. было выдана некалькім сябрам сац. партыі для агітацыйных мэтаў, 450,000 фр. рожным арганізацыям, 170,000 фр. на дарожныя выдаткі, 113,000 фр. на агітацыю ў арміі і флёце і 60,000 нейкаму Альбэру. Усе гэтыя грошы былі выплачаны у працягу першых 7 мес. гэтага года,

РАДАВЫ ШПІЯНАЖ У ЛАТВІІ.

У рожных местах Латвіі арыштавана па падазрэньню ў шпіянажы 17 чалавек. Даведзена, што ўсе яны вялі шпіянаж выключна ў арміі і на карысьць Радавай Расеі. З адабраных у часе вобыскаў дакумантаў высьвятлілася, што арыштаваныя мелі пры сабе значныя сумы грошаў. Усе арыштаваныя — латвійскія грамадзяне.

ЯК АМЭРЫКА „РАЗБРАЯЕЦЦА“.

Прэзыдэнт Злучаных Штатаў зацьвярдзіў бюджэт марского міністэрства. Гэта зьяўляецца адказам на становішча, занятае Англіяй на жэнэўскай конфэрэнцыі трох дзяржаваў, якая, як ведама, не дала ніякіх вынікаў. Новы бюджэт прадбачыць будову 26 крэйсараў па 10,000 тонаў кожны, 3 вялікіх крэйсараў, маючых мэтаю служыць базаю для аэрапланаў, 11 падводных лодак, 16 вялікіх мінаносцаў і 4 браняносцы. Гэта будзе каштаваць 1,5 мільярда даляраў, ці на нашы грошы 13,5 мільярдаў злотых, што складае 6 нашых гадавых бюджэтаў.

ФРАНЦЫЯ УЗБРАЯЕЦЦА.

Палата дэпутатаў прыняла праграму павялічэньня францускага ваеннага флёта. Будзе выбудавана: 1 драдноўт, 6 контр-мінаносцаў, 5 падводных лодак і 3 мінаносцы.

І НЕМЦЫ БУДУЮЦЬ ВАЕННЫ ФЛЕТ.

Апрацаваная нямецкім марскім міністэрствам праграма адбудовы ваеннага флёту прадбачыць апрача знаходзячыхся на выканчаньні 4 крэйсараў і мінаносцаў будову яшчэ 4—5 крэйсараў у бліжэйшыя гады па 10,000 кожны. Гэтая праграма ня выходзіць з межаў вэрсальскага трактату.

Да усіх Беларусау.

Беларускі студэнскі саюз прыслаў да Рэдакцыі нашае газэты пісьмо просячы зьмясьціць наступную адозву да ўсіх Беларусаў:

„Ня кожнаму можа ведама, як цяжка здабыць вышэйшую асьвету сынам нашае беларускае вёскі па прычыне сялянскай нашай беднасьці. Але кожны добра ведае, што беларускае адраджэньне патрабуе шмат інтэлігэнцкіх кваліфікованых сілаў. Сілы гэтыя растуць па меры атрымліваньня нашаю моладзьдзю высокае асьветы, як на Бацькаўшчыне, так і за яе межамі.

Мы — беларуская студэнская моладзь, згуртаваная ў свой Беларускі Студэнскі Саюз Віленскага Унівэрсытэту імя Стэфана Баторага, ня маючы ніякага падтрыманьня прабіваем сабе шлях да навукі толькі сваімі ўласнымі сіламі, ды натугамі нашых бедных бацькоў — жыхароў вёскі.

Каб мець магчымасьць утрымаць на гэтым шляху сваіх зусім незаможных калегаў-студэнтаў, якія мусяць дайсьці да пастаўленае перад сабою мэты, сярод нас паўстала думка зьвярнуцца да ўсіх сьвядомых Беларусаў і спачуваючага нам грамадзянства іншай нацыянальнасьці з заклікам прылучыцца да грамадзкага падтрыманьня нас пасільнаю матэр'яльнаю падмогаю, якая палегчыць нашае жаданьне азброіцца ведаю, гэтак патрэбнаю нам для будучае творчае працы на славу і карысьць нашага Народу!

Ахвяраваныя падмогі просім перасылаць па адрэсу: Wilno, Białoruski Związek Akademicki ul. Św. Anny № 2.

Старшыня Саюзу (—) *Т. Куніцкі.*

Сэкрэтар (—) *С. Станкевіч.*

Іншыя газэты просім перадрукаваць".

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

ВЫНІКІ КАМУНІСТЫЧНАГА КОНГРЭСУ у МАСКВЕ.

Камуністычны конгрэс у Маскве закончыў сваю сэсію. Выбраны новы Цэнтральны Камітэт на 9 сябраў большы папярэдняга і складаецца з 71 сябры. Цэнтральная Кантрольная Камісія складаецца з 195 сябраў і павялічылася на 32 асобы. З новавыбраных асобаў Цэнтр. К-ту заслугоўваюць на ўвагу: Куйбышаў, Крупская (жонка Леніна), Менжынскі, Скрыпнік і Чубар. Трэба адцяніць, што ня быў выбраны быўшы сябра Орджэнікідзэ. У палітычнае бюро ўваходзяць: Бухарын, Варашылаў, Калінін, Молотаў, Рыкаў, Рутзумак, Сталін, Томскі і выбраны цяпер новы сябра Куйбышаў. Сэкрэтаром зноў быў выбраны Сталін. Пастаноўляна склікаць партыйныя конгрэсы праз два гады. Група выключаных з партыі апазыцыянэраў, якая падала просьбу аб прыняцьці іх зноў да партыі, скадаецца з 23 асобаў, сярод якіх знаходзяцца Зіноўеў і Лашэвіч. Рыкаў заявіў у канцы конгрэсу, што савецкія ўлады будуць адносіцца да апазыцыянэраў з гэткімі-ж строгасьцямі, як да іншых палітычных групаў.

ДАЛЕЙШЫЯ ВЫКЛЮЧЭНЬНІ АПАЗЫЦЫЯНЭРАУ З ПАРТЫІ.

Конгрэс камуністычнай партыі вынес на паседжаньні 18 сьнежня ўхвалу аб далейшых выключэньнях з камуністычнай партыі. З гэтай рэзалюцыі вынікае, што апазыцыя, як гэта высьвятлілася ў часе конгрэсу, дзеліцца на тры фракцыі. Першая з іх з Ракоўскім, Муралавым і Радэкам ня толькі не хацела адрачыся ад сваіх апазыцыйных перакананьняў, але нават дамагалася свабоды прапаганды іх. Другая фракцыя, рэпрэзэнтуемая Каменевым і Еўдакімавым, гатова была адрачыся ад прапаганды сваіх перакананьняў, толькі ня хоча забавязацца бараніць афіцыяльную пазыцыю партыі. Абедзьве гэтыя фракцыі злажылі адносныя мэмарыялы, якія конгрэс адхіліў, прыняўшы рэзалюцыю камісіі, якая трэбуе выключэньня апазыцыянэраў з партыі. З выбітных камуністаў выключаны з партыі: Аўсэн, Бакаеў, Каменеў, Еўдакімаў, Лазарэвіч, Муралаў, Пятакоў, Радэк, Ракоўскі, Сахараў, Смілга, Смірноў і Сапронаў.

ДАЙШЛА ЧАРГА І ДА ТУХАЧЭУСКАГА.

У выніку вострага канфлікту з Варашылавым быўшы камандуючы савецкаю арміяй проці Польшчы ў 1920 г. Тухачэўскі звольнены з займаемага ім становішча начальніка гэн. штабу. Ен абвінавачваецца ў падтрыманьні адносінаў з апазыцыяй і трыманьні ў штабе афіцэраў апазыцыянэраў.

„ГОРДАСЬЦЬ РЭВАЛЮЦЫІ".

У дзень урачыстага сьвяткаваньня 10 гадовага юбілея Г. П. У. (чэка) Мэнжынскі ў сваей прамове сказаў, што Г.П.У. зьяўляецца „гордасьцю расейскай рэвалюцыі", Яно і далей будзе прадаўжаць сваю працу, не застанаўліваючыся ні перад якімі перашкодамі. Партыйны зьезд ухваліў, што старшыня Г. П. У. павінен уваходзіць у палітбюро з рашучым правам голасу. Адсюль відаць, што правы Г.П.У. пашыраны.

АПАЗЫЦЫЯ ПАДЫМАЕ ГАЛАВУ.

У зьвязку з паражэньнем камуністаў у Кітаі апазыцыя зноў падняла галаву. Няўдача камуністычнага выступленьня у Кітаі тлумачыцца тым, што яно павінна было наступіць абавязкова у часе партыйнага зьезду у Маскве і дзеля гэтага было падрыхтована насьпех. Дзеля гэтага апазыцыя ўсю адказнасьць за паражэньне камуністаў у Кітаі зваліваe на Сталіна.

Таемнічыя пажары у Менску.

У працягу некалькіх дзён у Менску сыстэматычна гараць рожныя фабрыкі і ўрадавыя склады. Ужо згарэлі фабрыкі „Торгстрой", тытунёвая фабрыка „Рэкорд", мылаварная фабрыка, тытунёвая фабрыка „Менскай Сялянскай прамысловасьці", фабрыка нітак і інш. Згарэў зусім склад ваенных мундзіраў на вуліцы Савецкай № 87. Паводле курсуючых у месьце чутак гэта зьяўляецца актам помсты таемнічай тэрорыстычнай арганізацыі.

Тутэйшая хроніка.

Рэдакцыя і Адміністрацыя „Беларускага Слова" шчыра вітае усіх сваіх паважаных Чытачоў і Прыхільнікаў з Новым Годам!

— **„МАР'ЯНЭТАЧНАЯ" АФЭРА ПЕТРЫ БУЛГАКА.** Урад Т-ва „Беларускай Хаткі ў Вільні" пацягнуў да судовай адказнасьці беларускага артысту Булгака, які раней працавай у тэатры „Reduta" (польска-нацыянальны!), а цяпер састаіць рэжысэрам раз'езнага тэатру Беларускага Т-ва „Інстытуту Гаспадаркі і Культуры", — па абвінавачаньню ў наступнай афэры: ў пачатку гэтага года „артыста" П. Булгак запрапанаваў Т-ву „Бел. Хаткі" зрабіць тэатр ляляк (мар'янэтачны). Была падпісана ўмова на 400 зл. Падпісаўшы ўмову і атрымаўшы аванс, П. Булгак праз нейкі час зрабіў з воску пару галоў ляляк і, паказваючы іх, жадаў усё новых і новых авансаў. Між тым праца на дальш гэтых галовак ляляк так і не пасувалася. А калі Урад „Бел. Хаткі" заўважыў, што „мар'янэтачны артыста" толькі акуляры ўцірае сваімі лялькамі, каб выцягнуць грошы і стаў радзей выдаваць авансы, чакаючы пакуль-жа нарэшце „аматар ляляк" пакажа хоць рукі і ногі сваіх твораў, дык п. Булгак зусім перастаў зьяўляцца ў памешканьне „Хаткі" і спатыкацца з сябрамі ўраду.

Гэткім чынам п. Булгак высмактаў па пару маленькіх галовак ляляк ажно... 210 зл., не выпаўніўшы падпісанай умовы.

Праканаўшыся, што гэта была звыклая афэра, ўрад „Хаткі" пацягнуў аматара лёгкай нажывы да судовай адказнасьці па абвінавачаньню ў афэры.

Цяпер гэты „аматар ляляк" рэжысыруе ў беларускім раз'язным тэатры т-ва „Інстытуту Гаспадаркі і Кільтуры" і атрымлівае, як кажуць, каля 800 зл. у месяц, у той час як артысты працуюць амаль дарма.

Сьвет бачыў рожнага гатунку „артыстаў", але гэткіх „аматараў ляляк" і „дырэктароў мар'янэтачных тэатраў" трэба са сьвечкаю шукаць. Пры гэткіх „артыстычных" здольнасьцях п. П. Булгак відаць далёка пойдзе...

— **Арышт б. пасла Шакуна.** 22 сьнежня па загаду судавых уладаў быў арыштаваны быўшы пасол Сойму Шакун. Ен, як ведама, быў выбраны па сьпіску Вызваленьня. Выступіўшы з гэтай партыі Шакун далучыўся да Незалежнай Партыі Хлопскай. Пасьля разьвязаньня ўладамі гэтай партыі Шакун разам з Шапелем зарганізаваў „Сялянскую Партыю Зямель Беларускіх". Шапель арыштаваны за антыдзяржаўнуюдзеяльнасьць, калі быў паслом.

— **М. АДАМОВІЧ (ДЗЯРГАЧ) — БАЛЬШАВІЦКІ АГЭНТ.** Рожныя газэты зьмясьцілі вельмі цікавыя даныя аб высяляным нядаўна з Вільні разам з некалькімі расейцамі М. Адамовічу (Дзяргачу) Іх, як ведама, гданьскія ўлады не прынялі, і яны да самага апошняга часу жылі ў польскім пагранічным месьце Тчэве. Польскія ўлады выдавалі бясплатнае памешканьне і грашовую запамогу. І вось, як паведамляюць газэты, няведама якім спосабам і пры чыей пратэкцыі М. Адамовіч апынуўся на гданьскім грунце і распачаў правакацыйную дзеяльнасьць у адносінах сваіх калегаў. Адамовіч, як даверaная асоба і актыўны сябра расейскай манархістычнай арганізацыі ў Бэрліне пад назв. „Братство Русской Правды", да каторай належыць і кн. Кірыл, атрымлівае ад старшыні гэтай арганізацыі палкоўніка Кольбэрга экзэмпляры выходзячага ў Бэрліне манархістычнага органу „Правда". Матэр'ял гэты Адамовіч прадае бальшавікам за добрую плату. Апрача таго атрымлівае значныя сумы з Бэрліну. Тры тыдні назад Адамовіч паведаміў бальшавікоў аб маючым адбыцца ў Гданьску зьезьдзе „Братства Русской Правды". І, выступаючы як арганізатар зьезду, прывёў на зьезд бальшавіцкага агэнта, прадставіўшы яго, як сябру арганізацыі і ахвяру бальшавіцкага тэрору, і здолеў да гэткага стопня выклікаць даверра, што гэтаму агэнту выдана была нават 50 зл., запамогі.

На віленскім бруку Адамовіч выступаў як „заядлы антыбальшавік" і „арганізатар антыбальшавіцкіх паўстаньняў на Усх. Беларусі", блутаючыся з пацазрыцельнымі і цёмнымі асобамі з расейскіх манархістычных колаў, у тым ліку і з Міткевічам з Наваградчыны. Дык цяпер, нарэшце, высьвятлілася аблічча і роля гэтага „антыбальшавіка" і „расейскага манархістага"...

Паводле апошніх вестак з Данцыга Адамовіч арыштаваны данцыгскімі ўладамі і пасаджаны ў турму за распаўсюджаньне фальшывых бальшавіцкіх чырвонцаў.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Клецк.

(*гм. Клецкая, Нясьвіскага павету*).

26 лістапада адбыліся у нас выбары ураду Клецкай гміны. На войта выбрана Дземенік Ігнат, заст. войта Конан Янка і лаўніка гр. Таўкач. Радныя пры выбарах разьбіліся на 2 лягэры, — адзін беларускі і другі польскі.

Беларусы ўсе галасавалі за выжэй паказаных грамадзян, а палякі за старога войта п. Баркоўскага, і беларусы перамаглі.

Але стараста не зацьвердзіў і 2 сьнежня адбываліся перавыбары.

Выступалі з прамовамі: радны Рагальчык-беларус, які падкрэсьліў, што п. Стараста не зацьвердзіўшы нашых выбранцаў, не даў ніякіх падставаў, апрача п. 41.

Далей прамаўлаў п. Інспэктар Блаўсэвіч, які жадаў, каб выбіралі асобу, якая была-б фактычным гаспадаром гміны, а не каго іншага.

Гэта зусім зразумела што так, але-ж тутка ёсьць пытаньне; ці-ж Дземенік горшы гаспадар ад п. Баркоўскага? Можна сьмела сказаць, што розьніца паміж імі ўсяго толькі тая, што адзін — паляк-каталік, а другі — беларус - праваслаўны, дый пры тым яшчэ Дземенік мае сярэдняю адукацыю, а Баркоўскі яе ня мае...

Далей прамаўляў яшчэ асаднік п. Скатніцкі які ўчапіўся да раднага Мікірэя і папракаў яго за даклад на Зьезьдзе Радных у Вільні 6 — 7-XI-27 г., дзе быццам Мікірэй падзеляў радных палітычна. Як відаць радному Скатніцкаму не падабалася, што яго назвалі палякам дый асаднікам. Але ня ведама яшчэ, хто першы пачаў дзяліць радных палітычна — ці Мікірэй, ці п. Баркоўскі?

Пасьля былі запрапанаваны 2 ўнескі: першы, які запрапанаваў радны Рагальчык, каб выбраць новы урад і другі, які ўнёс п. Скатніцкі, — как выбраць стары ўрад з войтам Баркоўскім.

На галасаваньні першага ўнёску засталіся выбранымі 6-цю галасамі проці 4-х ізноў на войта гр. Дземенік, на заступніка — Конан і на лаўніка замеcта Таўкача, які сам адмовіўся — п. Твароўскі. На гэтым перавыбары і скончыліся. Чакаем, што будзе далей

Цікава адцеміць, што б. войт Баркоўскі заставіў солтысаў зьбіраць у вёсках подпісы да старасты, што быццам ўся гміна ня хоча мець войтам Дземеніка, а толькі п. Баркоўскага, і што быццам Дземенік ня мае „зауфаньня" ў гміне і асоба няпісьменная. І гэтыя подпісы адбіраюцца не ў гаспадароў, а хлапчукоў, як напр. у вёсцы Гусакі-Навадворскія падпісаліся нейкі Сямуха Паўлюк 15 гадоў і Шыбут Міхась 19 гадоў.

І вось гэткім чынам п. Баркоўскі зьбірае сабе „zaufanie gminy"...

Радны.

Голас з Маладэчаншчыны.

Ня гэтак даўно Маладэчаншчына была затручана Грамадою. Цяпер яе няма і пра яе ня станем успамінаць, бо народ наш ведае, што значыла Грамада і па ей загнаў „асіновы кол".

Гляньмо-ж цяпер на Маладэчаншчыну, як на першую пляцоўку Грамады. Як яна цяпер закрасавала здаровым, моцным паветрам пасьля бур і туманаў! Дзе падзеўся той настрой сялянства, які улажыла Грамада? Дзе падзеліся агэнты Грамады? Як прапаў той настрой ненавісьці да польскае ўлады. Беларускі народ сам стаў на шлях праўдзівы. І цяпер мы бачым, што ня толькі „першая пляцоўка" Грамады — Маладэчаншчына ачысьцілася ад бруду Грамады, але нават уся Зах. Беларусь і пачала арганізавацца ў адзіную праўдзівую арганізацыю — заступніцу нашых правоў, гэта у Беларускую Нацыянальную Раду і Партыю з культурна-прасьветным Т-вам „Прасьвета". І вось там, дзе колькі хвілін назад была „камуністычная Грамада", цяпер там узрастаюцца аддзелы Бел. Т-ва „Прасьветы", арганізуюцца бібліятэкі — чытальні, ладзяцца спэктаклі і г. д. і г. д., дзе ніхто не цягне да адказнасьці і ніхто не перашкаджае ў працы. І мы ведаем, што усё сялянства пойдзе пад адзіны сьцяг Сел. Нац. Рады і Партыі, якая кліча да лепшае будучыні. І загінуць тыя агэнты б. Грамады (калі дзе яны ёсьць), як загінула і яна сама.

Браты Сяляне! Клічу вас, як братоў сваіх, арганізавацца пад сьцяг Беларускай Нацыянальнай Рады, ў якой толькі і ёсьць скарб нашай будучыні!

Янка.

10. XII. — 1927 г.

Перасьцярога.

(*З Ваўкавыскага пав.*).

Мы, сяляне Ваўкавыскага пав. пасылаем сваё вялікае спачуцьце Бел. Нац. Радзе і Партыі за іх працу на карысьць — нас — сялян на нашай Бацькаўшчыне і заклікаем усіх братоў Беларусаў, каму дорагі інтарэсы сваей Бацькаўшчыны Беларусі, хто хоча шляхам мірным і легальным, а не шляхам рэвалюцыі і тэрору вырашыць пытаньне аб нас, гаротных Беларусох, хто хоча дабра сабе і свайму Беларускаму Народу, — няхай пасьпяшаць за намі! Усе, як адзін, станьмо моцнай сьцяной каля Б. Н. Р. і П., той Партыі, каторая заслужыла сабе на увагу сваею карыснай працай для дабра нас, гаротных сялян, каторая ня будзе нас пхаць тысячамі да турмы, як пхала нас б. Грамада!

Браты Беларусы! Мы усе, як адзін у 1922 году аддавалі свае галасы за сьпісак № 16 і мелі надзею, што пасланыя намі паслы, прынясуць хоць крыху карыснага для нас сялян.. Якую ж карысьць яны нам прынясьлі, што мы атрымалі ад таго, што мы выслалі іх да Сойму?... Абсалютна нічога! Акрамя таго, што сотні нявінных сялян сталі ахвярамі іх шкадлівай палітыкі.

Дык усе, як адзін, гуртуйцеся каля Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі, якія накрэсьлілі сабе самы верны шлях, вядучы да лепшае будучыні нашу Бацькаўшчыну!

(*Сьледуюць подпісы*).

Паштовая скрынка.

Т. Маско, Ж, Шыпайка, Я. Даледудка, К. Маеўскі, К. Мацулевіч. Я. Мацяж — газэты па ўказаным адрэсам высылаецца.

Т Касьямюх — 1 зл. атрыман, газэту высылаем.

В. Кеноша з Амэрыкі — газэту высылаем.

К. Гром, Я. Воўбыр, В. Курыловіч, М. Шлык, С. Тупенька — газэты высылаюцца

„Супроцьклёну".— Вашая вершовая карэспандэнцыя не надаецца для друку.

Я. Турыс, А. Юмаковіч, Я. Бонцарэвіч. С. Галгоўскі, П. Аляксейчык. — газэта высылаецца.

Б. Шаравайка — 2 зл., Вл. Гордзейчык — 2 зл. Сям. Шалай — 2 зл. атрыманы,— газэта высылаецца

Мікалай Шацько, Б. Урублеўскі, Максім Шацько, М. Дэмецоў, М. Божко, М. Цэранавіч, Я. Рабіза, — газэта высылаецца.

В. А. Карэспандэнцыя „Войт страшыць" будзе зьмешчана ў наступным нумары.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.